УДК: 947,6

***В.П. Гарматны***

# БРАНІСЛАЎ ТАРАШКЕВІЧ І АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў СЕЙМЕ ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1922–1927 гг.)

В статье рассматривается деятельность Бронислава Тарашкевича в Сейме II Речи Посполитой (1922–1927 гг.) по защите интересов западнобелорусского крестьянства. Б. Тарашкевич был лидером Белорусского Посольского Клуба, хорошо знал положение крестьян и со знанием дела защищал их права. Ораторское умение и хорошо продуманные речи принесли Тарашкевичу широкую известность, что обеспокоило польские власти, которые, опасаясь влияния представителя западнобелорусского крестьянства, в нарушение Конституции пошли на арест посла Бронислава Тарашкевича.

## Уводзіны

Пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага міру амаль палова беларускіх зямель увайшла ў склад адроджанай Польшчы – ІІ Рэчы Паспалітай. Больш за 80% насельніцтва Заходняй Беларусі было занята ў сферы сельскай гаспадаркі, заходнебеларуская вёска была перанаселена і сялянам катастрафічна не хапала зямлі. Польскія ўлады перадавалі свабодныя ворныя землі з мэтаю ўзмацнення паланізацыі насельніцтва новадалучаных тэрыторый не мясцовым сялянам, а асаднікам (перасяленцам з Польшчы). Актыўным і непадкупным абаронцам інтарэсаў заходнебеларускіх сялян стаў Браніслаў Тарашкевіч, які на працягу 1922–1927 гг. быў паслом Сейма ІІ Рэчы Паспалітай і выказнікам у ім сялянскіх спадзяванняў.

## Выбары ў Сейм 1922 г. і стварэнне БПК

28 ліпеня 1922 г. на ўстаноўчым Сейме была прынята пастанова аб правядзенні выбарчай кампаніі ў Сейм і Сенат ІІ Рэчы Паспалітай, паводле якой выбары ў Сейм прызначаліся на 5 лістапада 1922 г., а ў Сенат – на 12 лістапада 1922 г. Такім чынам, у краіне распачалася выбарчая кампанія, актыўны ўдзел у якой прынялі прадстаўнікі беларускай меншасці. Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) прыняў рашэнне ісці на парламенцкія выбары сумесна з прадстаўнікамі іншых нацыянальных меншасцей ІІ Рэчы Паспалітай і ўвайшоў у склад блока нацыянальных меншасцей, створанага ў Варшаве 14–17 жніўня 1922 г.

Кіраваць выбарчай кампаніяй сярод беларусаў павінен быў створаны ў жніўні 1922 г. на чале з Антонам Луцкевічам Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт (БЦВК) з штаб-кватэраю ў Навагрудку [7, с. 149]. У склад БЦВК уваходзіў і вучоны з сусветнаю вядомасцю філолаг і перакладчык, аўтар першай граматыкі беларускай мовы, дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, член Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч (1892–1938), кандыдатура якога была таксама вылучана БНК на будучыя выбары [3, с. 204; 17, s. 152].

Прадстаўнікі БЦВК на працягу жніўня–верасня 1922 г. праводзілі актыўную і прадуманую палітычную агітацыю, ладзілі шматлікія сустрэчы з насельніцтвам Заходняй Беларусі, выпускалі публіцыстычную літаратуру, газеты і лістоўкі і такім чынам усталявалі з выбаршчыкамі даволі трывалую сувязь. Заходнебеларускія сяляне бачылі ў дзеячах БНК сваіх абаронцаў, таму лідары беларускай меншасці з’яўляліся рэальнымі кандыдатамі на месцы ў Сейме і Сенаце ІІ Рэчы Паспалітай.

Па выніках выбараў 5 лістапада 1922 г. БНК («шаснаццатка» па нумары блока ў выбарчых бюлетэнях) атрымаў 1397538 (15,9%) галасоў і 66 мандатаў (16% месцаў), у тым ліку беларусы (больш трох мільёнаў насельніцтва) занялі 11 месцаў у Сейме і 3 у Сенаце [1, с. 6; 11, с. 75]. Гэта быў вялікі поспех. Неабходна адзначыць, што ў

наступныя парламенцкія выбары прадстаўнікам Заходняй Беларусі ніколі больш не ўдавалася дасягнуць такіх вынікаў, нягледзячы на ўзрастаючую палітычную актыўнасць мясцовага насельніцтва.

Браніслаў Тарашкевіч прайшоў у Сейм ад Вільні (акруга № 63) [16, s. 81]. Васіль Рагуля, адзін з самых аўтарытэтных лідэраў заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, характарызаваў Тарашкевіча як «беларускага патрыёта, чалавека разумнага, што не паддаваўся ўплыву паланафілаў. Ён аднак лічыў, што ўгодаю можна дабіцца ад палякаў некаторых саступак на карысць беларускаму народу. Ён меў сярод палякаў шмат сымпатыкаў» [10, с. 22].

Вынікамі парламенцкіх выбараў беларусы ў цэлым былі задаволены: у інтэрв'ю журналісту газеты «Kurier Polski» (№ 327 ад 29 лістапада 1922 г.) Браніслаў Тарашкевіч катэгарычна запярэчыў сцвярджэнню аб фальсіфікацыі выбараў і запэўніў, што ў будучым Сейме беларусы будуць выступаць сумесна з прадстаўнікамі іншых нацыянальных меншасцяў і левых арганізацый. Тарашкевіч таксама адзначыў асноўныя праграмныя патрабаванні беларускіх прадстаўнікоў, сярод іх былі матэрыяльная дапамога для вясковых гаспадарак Заходняй Беларусі з мэтаю іх аднаўлення і поўная адмена закону аб вайсковым асадніцтве [3, с. 211].

Сеймавыя прадстаўнікі Заходняй Беларусі з мэтаю каардынацыі сваіх намаганняў па абароне жыццёва важных інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў стварылі ў польскім парламенце сваю арганізацыю – Беларусі пасольскі клуб (БПК) [9, с. 393]. Старшынёю БПК адзінадушна абралі Браніслава Тарашкевіча, яго намеснікамі сталі Адам Станкевіч і Сяргей Баран, членамі прэзідыуму – Антон Аўсянік і Вячаслаў Багдановіч. Сярод удзельнікаў БПК ён атрымаў назву «Малы парламент», бо ў ім былі прадстаўлены ўсе існуючыя ў заходнебеларускім нацыянальным руху палітычныя напрамкі [12, с. 121]. Сакратарыяты БПК былі створаны ў 15 заходнебеларускіх гарадах і мястэчках: Навагрудку, Гродна, Баранавічах, Стоўбцах, Ваўкавыску, Лідзе, Нясвіжы і г.д. [4, с. 24].

У склад кожнай сеймавай камісіі ўвайшло па адным пасле ад Заходняй Беларусі. Сам Тарашкевіч стаў членам камісіі асветы, але, па адзнаках сучаснікаў, у адрозненне ад большасці сеймавых паслоў, якія «спецыялізаваліся» ў сваіх выступленнях па вузкіх пытаннях, Б.А. Тарашкевіч выступаў па многіх праблемах, у тым ліку вельмі актыўна па аграрнай [8, с. 49, 62].

**Сеймавыя выступленні Браніслава Тарашкевіча супраць польскай аграрнай палітыкі (1922–1923 гг.)**

23 студзеня 1923 г. Браніслаў Тарашкевіч упершыню выступіў у Сейме з вялікаю прамоваю, у якой раскрытыкаваў сістэму кіравання польскіх улад на «Крэсах Усходніх» і выклаў праграмныя патрабаванні БПК і насельніцтва Заходняй Беларусі: неадкладнае спыненне штучнай каланізацыі, скасаванне асадніцтва, нацыяналізацыю лясоў і вод, правядзенне аграрнай рэформы ў інтарэсах малазямельнага і беззямельнага сялянства, стварэнне адміністрацыі з мясцовага насельніцтва, дапушчэнне беларускай мовы ў адміністрацыйныя і судовыя ўстановы, увядзенне дэмакратычнага разгляду судовых спраў, забяспечэнне тэрытарыяльнай арганізацыі арміі і г.д. [6, с. 62; 11, с. 75]. Патрабаванні былі даволі сціплымі і абмяжоўваліся нацыянальна-культурнай аўтаноміяй, але ўсе яны былі адхілены Сеймаваю правацэнтрысцкаю большасцю. У сваёй прамове Тарашкевіч трапна адзначыў асноўную мэту дзейнасці БПК: «Пераступілі гэты парог (Сейма) у колькасці, папраўдзе, неадпаведнай да масы беларускага народа, які мы маем права прадстаўляць, але дастаткова для таго, каб не толькі перад Польшчай, але перад усім светам даць доказ таго, што жыве беларускі народ» [9, с. 394].

23 сакавіка 1923 г. пры абмеркаванні тэрміновай прапановы сялянскай партыі ПСЛ-«Пяст» (PSL-«Piast») аб наданні вайсковым асаднікам дзяржаўнага крэдыту Тарашкевіч адзначыў: «Асадніцтва мае мэту перасялення пэўнай колькасці польскага насельніцтва «на Крэсы» для таго, каб у самой Польшчы захаваць панскія маёнткі». Прамоўца патрабаваў поўнай ліквідацыі асадніцтва, перадачы адведзенай ім сумы на ажыццяўленне аграрнай рэформы і аднаўленне дашчэнту разбуранай вайной эканомікі «Крэсаў Усходніх». Пытанне насаджэння вайсковых асаднікаў на землях паўночна-ўсходніх ваяводстваў ІІ Рэчы Паспалітай стала адным з самых актуальных і абмяркоўваемых у Сейме на працягу 1922–1925 гг. [13, с. 28]. Як падкрэсліваў лідар беларускіх паслоў, «зямля, на якой народ сядзіць тысячы гадоў, на якой ён вякамі пралівае пот і кроў, зямля гэтая павінна яму належаць» [8, с. 49], у адваротным выпадку, сцвярджаў Тарашкевіч, «хутка ўсе вашыя памешчыцкія і асадніцкія паселішчы пойдуць з дымам пажараў» [3, с. 50].

Аграрнае пытанне стала для заходнебеларускіх паслоў галоўнай складаючай часткай іх дзейнасці. Тарашкевіч і яго паплечнікі выкарыстоўвалі кожную магчымасць для абароны заходнебеларускага сялянства, патрабавалі ад улад уключэння мясцовага насельніцтва ў правядзенне аграрнай рэформы, падкрэслівалі, што ад урэгулявання зямельнага пытання залежаць адносіны насельніцтва Заходняй Беларусі да польскіх улад. Б. Тарашкевіч і яго паплечнікі падтрымлівалі цесныя кантакты з членамі Украінскага клуба, але пры гэтым вылучалі больш радыкальныя прапановы, што не перашкаджала агульнаму саюзу прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей [1, с. 8; 15, с. 273].

На сустрэчах з выбаршчыкамі беларускія паслы запісвалі патрабаванні мясцовага сялянства, а потым афармлялі іх скаргі ў форме запросаў у Сейм. Беларускія сеймавыя прадстаўнікі рабілі запыты ў Сейме па шматлікіх фактах парушэння прадстаўнікамі польскай адміністрацыі законных правоў сваіх выбаршчыкаў, выступалі з крытыкай нацыянальнай, аграрнай і культурнай палітыкі польскага ўраду [10, с. 33]. Члены БПК 52 разы выступалі супраць страты зямлі заходнебеларускімі сялянамі, 82 разы супраць іх эканамічнай эксплуатацыі і 218 разоў супраць незаконных учынкаў прадстаўнікоў дзяржаўнай улады [18, р. 136]. Беларускія паслы сталі ледзьве не апошняю інстанцыяй для скаргаў мясцовага сялянства. Найчасцей ад імя БПК выступаў сам Браніслаў Тарашкевіч, які вобразна і красамоўна сведчыў аб глыбокім, пранікнёным веданні палітычнага і эканамічнага становішча краіны, акрамя таго адчувалася свабоднае валоданне прамоўцам лепшымі дасягненнямі сучаснай яму філасофскай і палітычнай думкі. За ўвесь перыяд сваёй сеймавай дзейнасці Тарашкевіч выступаў у польскім парламенце 34 разы: у 1923 г. і 1924 г. па 9, у 1925 г. і 1926 г. – па 8 разоў. Неабходна адзначыць, што за эмацыянальныя выступленні і крытыку польскіх улад Тарашкевіч заклікаўся маршалкамі Сейму да парадку 5 разоў, да парадку з запісам у пратакол 1 раз і выдаляўся з залы пасяджэнняў 2 разы [16, s. 119–120].

Выдадзеныя ў форме асобнай кнігі запыты заходнебеларускіх паслоў у Сейм II Рэчы Паспалітай далі ўсяму свету рэальную карціну праходзячых у Заходняй Беларусі складаных сацыяльна-эканамічных працэсах і выклікалі шырокі грамадскі рэзананс [5]. Чэхаславацкая газета «Rude pravo» прысвяціла інтэрпеляцыям беларускіх паслоў у польскі Сейм спецыяльную разгорнутую публікацыю і назвала іх «крываваю кнігаю» [8, с. 64; 13, с. 27–28].

Пра сваю парламенцкую дзейнасць члены БПК рабілі перыядычныя справаздачы перад сваім электаратам. Так, 15 і 30 красавіка 1923 г. адбыліся сустрэчы беларускіх сеймавых паслоў у Баранавічах і Навагрудку, дзе яны расказалі насельніцтву пра вынікі сваёй сеймавай працы і заслухалі наказы выбаршчыкаў. Як адзначалі з незадавальненнем польскія ўлады, на такіх сустрэчах паслы «праводзілі агітацыю,

варожую Польшчы», і «пасля кожнага такога мітынга людзі ўсё больш узбуджаюцца і яўна непаважна адносяцца да польскіх улад» [1, с. 7].

30 верасня 1923 г. Б. Тарашкевіч зрабіў у БНК падрабязную справаздачу сваёй seймавай дзейнасці. У прынятай рэзалюцыі адзначалася, што беларускія паслы строга імкнуліся да выканання ўзятых перад выбаршчыкамі абавязкаў, але ніводзін з іх не ўдалося рэалізаваць з-за процідзеяння польскага Сейма і ўрада.

У снежні 1923 г. прадстаўнікі БПК спрабавалі дамовіцца з паслом Станіславам Тугутам, прэтэндэнтам на пасаду прэм'ер-міністра Польшчы. Тарашкевіч і яго паплечнікі пагадзіліся падтрымаць кандыдатуру Тугута пры цэлым комплексе ўмоў: перш за ўсё-спыненне палітыкі насаджэння асадніцтва і ўтварэнне міністэрства беларускіх спраў [16, s. 88–89]. Удзельнікам перамоў не ўдалося дасягнуць паразумення, і ў выніку новым кіраўніком ураду стаў Уладзіслаў Грабскі, які не збіраўся ісці на кампрамісы, калі яны могуць «дражніць польскую люднасць».

У сваёй прамове ў Сейме ад 14 снежня 1923 г. Тарашкевіч паказаў тры краевугольныя камяні польскай аграрнай палітыкі і яе сапраўдныя мэты: імкненне да захавання буйной зямельнай уласнасці з захаваннем класа памешчыкаў; экспансія на этнаграфічна няпольскія землі і ваенна-палітычны аспект, а таксама паказаваў складанае становішча беларускіх сялян, якія ў сярэднім валодалі па 3–4 гектары зямлі, прычым многія з іх былі наогул беззямельнымі [8, с. 50–51; 13, с. 129].

**Раскол БПК і стварэнне БСРГ (1923–1927 гг.)**

Прадстаўнікам БПК з цягам часу становіцца ўсё цяжэй прыняць адзінае рашэнне, паміж левым і правым крылом беларускіх прадстаўнікоў узрастаюць супярэчнасці па пытанні тактыкі і метадаў сеймавай барацьбы. Антон Луцкевіч настойліва звяртаў увагу Тарашкевіча на тое, што раскол у БПК «для беларускага нацыянальнага прадстаўніцтва ў Сейме быў бы катастрофаю… з беларускімі пасламі пасля расколу сталі б лічыцца яшчэ менш». Луцкевіч прапаноўваў Б. Тарашкевічу, не выходзячы з клуба, стварыць у ім сваю секцыю, якая б у парламенце дзейнічала сумесна з БПК, а па-за межамі Сейма працавала самастойна, але пераадолець крызіс беларускім прадстаўнікам не ўдалося. 15 снежня 1923 г. Браніслаў Тарашкевіч паўторна абраны старшынёю БПК, але ўжо ў канцы лютага 1924 г. вымушаны быў пакінуць сваю пасаду, а новым кіраўніком БПК стаў В. Рагуля [10, с. 40]. Як трапна адзначыў былы старшыня БПК «зямельная рэформа парцэлюе (падзяляе) не толькі землі, але і клубы» [8, с. 52].

Адносна вырашэння аграрнага пытання заходнебеларускія сеймавыя прадстаўнікі прытрымліваліся двух супрацьлеглых накірункаў: Васіль Рагуля са сваімі паплечнікамі выступаў за стварэнне новай радыкальнай сялянскай партыі, у праграму дзейнасці якой прапанавалася паставіць бясплатнае адчужэнне на базе нацыяналізацыі ўсіх родаў зямлі і бясплатнае надзяленне ёю малазямельных і беззямельных сялян на аснове хутарской сістэмы, а Б. Тарашкевіч і яго прыхільнікі выказваліся за цеснае супрацоўніцтва з КПП і Незалежнай сялянскай партыяй (НПХ, NPCh) [7, с. 153; 17, s. 152]. Браніслаў Тарашкевіч адзначаў, што «…сёння ў польскім Сейме і па-за ім няма партыі, акрамя камуністычнай фракцыі, якая б не падзяляла каланізацыйных памкненняў» [15, с. 275].

У выніку працяглых дыскусій вясною 1925 г. беларускія прадстаўнікі канчаткова прыйшлі да высновы аб неабходнасці спалучэння сеймавай дзейнасці з выкарыстаннем новых спосабаў барацьбы за правы беларускага насельніцтва і ў першую чаргу пошуку падтрымкі па-за межамі польскага парламента. У сваім змястоўным артыкуле ў беларускай газеце «Крыніца» ад 17 мая (№ 20) 1925 г. Тарашкевіч абвясціў неабходнасць стварэння сялянска-рабочага ўраду, «бо толькі

супольным фронтам – мужык ля мужыка, мужык побач з работнікам на роўных правах – мы можам адваяваць сабе вызваленне сацыяльнае, вызваленне нацыянальнае і вызваленне палітычнае і нацыянальнае адраджэнне… беларускія працоўныя масы ў гэтай барацьбе павінны падаць руку сялянам украінскім, сялянам польскім і ўсяму працоўнаму люду [7, с. 153].

24 чэрвеня 1925 г. Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Валошын і Пётр Мятла выйшлі са складу БПК і стварылі пасольскі клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ, Грамады) [2, с. 58; 12, с. 121]. Карыстаючыся пасольскаю недатыкальнасцю, лідары БСРГ разгарнулі актыўную работу па стварэнні масавай арганізацыі працоўных для барацьбы за свае правы. З узнікненнем Грамады узаемаадносіны паміж БПК і польскімі ўладамі становяцца ўсё больш. Калі прадстаўнікі правага крыла БПК яшчэ спрабавалі знайсці ўзаемапаразуменне з польскімі ўладамі, то Тарашкевіч і яго паплечнікі па БСРГ пад уплывам камуністаў фактычна перайшлі ад праграмы мірнага адраджэння да класавай барацьбы супраць «белапольскіх акупантаў» [11, с. 76].

Разлад у ідэалагічным напрамку не абазначаў прынцыповых разыходжанняў беларускіх паслоў на сутнасць аграрнай рэформы, сведчаннем чаго з’яўляецца падтрымка ўсіх прапаноў БСРГ па зямельным пытанні членамі БПК. Нягледзячы на праграмныя рознагалоссі беларускіх паслоў аб’ядноўвала мэта абароны эканамічных і сацыяльных інтарэсаў беларускага сялянства, але левае і правае крыло БПК ішлі да гэтага шляху ў розных накірунках [15, с. 272].

Пададзены Браніславам Тарашкевічам 30 чэрвеня 1925 г. у Сейм ад імя трох левых фракцый польскага парламента: камуністаў, НПХ і БСРГ – аграрны законапраект, паводле якога прадугледжвалася шырокае надзяленне бяднейшых сялян зямлёю без выкупу, не знайшоў падтрымкі сеймавай большасці.

17 ліпеня 1925 г. Тарашкевіч выступіў з прамоваю супраць законапраекта аб парцэляцыі і асадніцтве: «Уся памешчыцкая і царкоўная зямля з будынкамі і інвентаром павінна быць канфіскавана без кампенсацый і бясплатна падзелена сялянскімі камітэтамі паміж беззямельным і малазямельным насельніцтвам», – але ізноў безвынікова. Прамоўца адзначаў, што «рашучая барацьба за зямлю ўваходзіць у новую фазу. Сейм зямлі сялянам не даў і не дасць. Зямлю сяляне павінны ўзяць і возьмуць яе самі» [8, с. 77].

26 ліпеня 1925 г. Сейм ІІ Рэчы Паспалітай па прапанове ўрада Уладзіслава Грабскага пры падтрымцы Польскай сацыялістычнай партыі (PPS) і «ПСЛ-Вызваленне» (PSL-Wyzwolenie) прыняў агульнавядомы «Закон аб правядзенні зямельнай рэформы», які ўвайшоў у гістарыяграфію пад назвай «Закон аб парцэляцыі і асадніцтве».

28 снежня 1925 г. Сейм ІІ Рэчы Паспалітай прыняў канчатковы варыянт аграрнай рэформы, які і стаў ажыццяўляцца. Прыняты закон быў самым кансерватыўным з абмяркоўваемых, бо прадугледжваў масавае перасяленне на «Крэсы Усходнія» вайсковых і цывільных (грамадзянскіх) асаднікаў, а не перадачу свабодных ворных земель малазямельным і беззямельным сялянам [14, с. 33–34]. За закон аб аграрнай рэформе прагаласавалі прадстаўнікі правых польскіх палітычных партый, а Браніслаў Тарашкевіч і іншыя члены БПК выступілі супраць.

Расчараваны аграрнаю і нацыянальнаю палітыкаю польскіх улад Браніслаў Тарашкевіч у снежні 1925 г. уступае ў КПЗБ [2, с. 88], бо бачыць у камуністах адданых прыхільнікаў абароны інтарэсаў працоўных, актыўных змагароў з польскім панаваннем і ў сувязі з гэтым найбольш блізкіх палітычных саюзнікаў БСРГ і ўсяго заходнебеларускага насельніцтва. Тарашкевіч бачыў, што праз польскі Сейм

немагчыма дабіцца надзялення зямлёю малазямельных і беззямельных сялян Заходняй Беларусі, і лічыў, што здолее дасягнуць гэтага ў саюзе з камуністамі.

Дзякуючы актыўнай і прадуманай дзейнасці Тарашкевіча і яго паплечнікаў БСРГ з цягам часу стала самаю масаваю і ўплывоваю сялянскаю партыяй Еўропы: амаль у кожнай заходнебеларускай вёсцы існаваў яе гурток [10, с. 52]. Б. Тарашкевіч шмат ездзіць па Заходняй Беларусі, праводзіць шматлікія сустрэчы і гутаркі з мясцовымі сялянамі. Тарашкевіч добра ведаў патрэбы і памкненні беларускага насельніцтва, якія леглі ў напісаную ім і апублікаваную ў Бюлетэні пасольскага клуба «Беларуская сялянска-рабочая грамада» праграмы новай партыі. У ёй патрабаванне канфіскацыі зямель (абшарніцкіх, дзяржаўных, царкоўных і г.д.) і іх падзел сялянскімі камітэтамі і сельскімі рабочымі, маючы перш за ўсё на ўвазе інтарэсы сельскай беднаты [16, s. 108].

Шмат дзе сяляне цэлымі вёскамі запісваліся ў БСРГ. Многія пярвічныя арганізацыі ППС і «ПСЛ-Вызваленне» ў поўным складзе пераходзілі ў БСРГ, што занепакоіла польскія ўлады, і ў студзені 1927 г. Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Валошын і яшчэ звыш 400 актывістаў Грамады без згоды Сейма былі арыштаваны. У сакавіку 1927 г. польскія ўлады БСРГ аб`явілі незаконнай арганізацыяй і забаранілі яе, а сялян сілаю прымушалі здаваць членскія білеты.

4 лютага 1927 г. пасля даклада пасла Стэфана Дабжанскага (Нацыянальна-народны саюз, ZLN) Сейм выказаўся за пазбаўленне Б. Тарашкевіча і яго бліжэйшых паплечнікаў пасольскай недатыкальнасці і выдачу пад суд: «за» прагаласавалі 159 паслоў Сейма, «супраць» – 89, несапраўднымі прызнаны 12 картак (па іншых звестках – 163, 89 і 10 адпаведна) [6, с. 335; 10, с. 93]. Арышт стаў канцом і непазбежным вынікам актыўнай і паслядоўнай сеймавай дзейнасці «беларускага Гандзі» (як часам называлі Браніслава Тарашкевіча) па абароне інтарэсаў заходнебеларускага сялянства.

**Заключэнне**

Браніслаў Тарашкевіч самаадданa і паслядоўна адстойваў у Сейме правы сялян Заходняй Беларусі, актыўна выступаў за правядзенне аграрнай рэформы на іх карысць: за спыненне насаджэння асадніцтва і перадачу свабодных ворных зямель мясцовым сялянам. Аграрныя законапраекты Б. Тарашкевіча не былі падтрыманы сеймаваю большасцю і не рэалізоўваліся. Сам Тарашкевіч за сваю актыўную дзейнасць быў пазбаўлены пасольскай недатыкальнасці і аддаactive пад суд.

Такім чынам, Браніслаў Тарашкевіч быў таленавітым і непадкупным абаронцам насельніцтва Заходняй Беларусі, выказнікам яго спадзяванняў і сапраўдным «адвакатам заходнебеларускага сялянства».

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Баюра, А.Н. Парламентская форма национально-освободительной борьбы населения Западной Беларуси в 1920–1925 гг. / А.Н. Баюра // Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : мат. респуб. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР, 24–25 сентября 2009 г. – / Брест : БрГТУ, 2009. – С. 5–10.

2. Валахановіч, А.І. Споведзь у надзеі застацца жывым… : Аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча / А.І. Валахановіч. – Мінск : БелНДІДАС, 1999. – 200 с.

3. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918–1922 гг.) / К. Гамулка. – Вільня : ЕГУ, 2008. – 256 с.

4. Говін, С.В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / С.В. Говін. – Мінск : БДУ імя У.І. Леніна, 1974. – 96 с.

5. Інтэрпеляцыі беларускіх паслоў у польскі Сойм 1922–1926 гг. Зборнік дакумантаў аб панскіх гвалтах, катаваннях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі ў Заходняй Беларусі. – Мінск : Беларус дзярж выд-ва, 1927. – 497 с.

6. Кароткі нарыс беларускага пытаньня / А. Вашкевіч, А. Пашкевіч, А. Чарнякевіч. – Мінск : Выдавец І.П. Логвінаў, 2009. – 396 с.

7. Ключынскі, М.В. Дзейнасць беларускай пасольскай фракцыі ў Польскім парламенце: ад стварэння да расколу / М.В. Ключынскі // Назаўсёды разам: гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага аднаўлення Беларусі (да 65-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР) : матэрыялы Рэспуб. навукю-тэарэт. канф., Мінск, БДПУ, 28 верасня 2004 г. – Мінск : БДПУ, 2004. – С. 149–154.

8. Ліс, А.С. Браніслаў Тарашкевіч / А.С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 168 с.

9. Марціновіч, А. Хто мы, адкуль мы… : гістарычныя эсэ, нарысы : у 3 кн. / А. Марціновіч. – Мінск : Беларусь, 2008. – Кн. 3. – 447 с.

10. Рагуля, В. Успаміны / В. Рагуля. – Менск : Бацькаўшчына, 1993. – 94 с.

11. Рамановіч, П.С. Нацыянальна-дэмакратычны рух на паўночна-ўсходніх землях Польшчы пасля Рыжскага дагавора / П.С. Рамановіч // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы : матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэт. канф., Мінск, БДУ, 16–17 сакавіка 2001 г. – Мінск : БДУ, 2001. – 210 с. – С. 74–78.

12. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.

13. Тарашкевіч, Б. Выбранае : крытыка, публіцыстыка, пераклады / Уклад., уступ, камент. А. Ліса. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 319 с.

14. Титова, А.А. Борьба революционного блока польского Сейма за демократическое решение аграрной проблемы во второй половине 1925 г. / А.А. Титова // Советское славяноведение. – 1988. – № 2. – С. 28–35.

15. Цітова, А. Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім Сейме ў 1922–1935 гг. / А. Цітова // Беларусіка=Albaruthenika : Кн. 3. Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне / Рэд. А. Мальдзіс [і інш.] – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 269–276.

16. Bergman, A. Rzecz o Bronislawie Taraszkiewiczu / A. Bergman. – Warszawa : Ksiazka i wledza, 1977. – 244 s.

17. Bergman, A. Sprawy bialoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : Panstwowe Wyd-wo Naukowe, 1984. – 288 s.

18. Lubachko, I.S. Belorussia under Soviet rule. 1917–1957 / I.S. Lubachko. – Lexington : The University press of Kentucky, 1972. – 220 p.

***Harmatny V.P.*** **Bronislav Tarashkievich and agrarian question in the Seim of II Rzeczy Pospolitej (1922–1927)**

Article deals with the activity of Bronislav Tarashkievich for the protection of Western Belarus peasants in the Seim of II Rzeczy Pospolitej (1922–1927). Tarashkievich was the leader of Belarusian Deputy Club; he knew well the difficulties and interests of Western Belarus peasants. Bronislav Tarashkievich protectsed peasants’ interests in Seim and as a result of his activity Tarashkievich was taken to prison.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.09.2010